# Рэалізацыя праязных білетаў па безнаяўным разліку

Для юрыдных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў маецца магчымасць набыцця білетнай прадукцыі па безнаяўным разліку.

**Рэалізацыя білетнай прадукцыі па безнаяўным разліку ажыццяўляецца** на станцыі «Плошча Леніна» (уваход з боку Мінгарвыканкама) толькі на ўмовах 100% перадаплаты. Рэжым работы касы: з 09.00 да 12.00 і з 13.00 да 16.00. Выхадны: субота, нядзеля. Тэлефон / факс 219-51-62.

**Парадак набыцця білетнай прадукцыі па безнаяўным разліку:**

1. Прадаставіць у касу па безнаяўным разліку або адправіць па ўказаным вышэй факсе пералік неабходнай білетнай прадукцыі.
2. Атрымаць у касе па безнаяўным разліку або па факсімільнай сувязі рахунак-фактуру і аплаціць рахунак.
3. Водпуск аплачанай білетнай прадукцыі ажыццяўляецца толькі пасля паступлення грашовых сродкаў на разліковы рахунак дзяржаўнага прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн», але не раней за 13–00 гадз. рабочага дня, наступнага за днём аплаты. Кліенты, якія звярнуліся для атрымання білетнай прадукцыі раней за ўказаны тэрмін, не абслугоўваюцца нават пры наяўнасці копіі плацежнага даручэння.
4. Дакументы, неабходныя для атрымання білетнай прадукцыі па безнаяўным разліку: даверанасць, завераная пячаткай арганізацыі, пашпарт асобы, указанай у даверанасці, копія плацежнага даручэння. Пры атрыманні тавару кіраўніком юрыдычнай асобы неабходна наяўнасць дакумента, які пацвярджае яго паўнамоцтвы (загад аб назначэнні на пасаду, выпіска з рашэння агульнага сходу, праўлення або іншага органа кіравання юрыдычнай асобы).

Для індывідуальнага прадпрымальніка – пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі. Для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў рэалізацыя білетнай прадукцыі па безнаяўным разліку можа ажыццяўляцца на падставе заключанага з дзяржаўным прадпрыемствам «Мінскі метрапалітэн» дагавора. Па пытанні заключэння дагавора неабходна звяртацца па тэл. 383- 81-16, 383-81-14, 383-81-15.